

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Жанчыне прысудзілі два гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай за абразу Лукашэнкі

19 кастрычніка ў судзе Клічаўскага раёна разгледжана крымінальная справа па абвінавачванні жыхаркі Бабруйска, 28-гадовай **Дзіяны Гушчы** ў публічнай абразе прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 КК).

Паводле абвінавачвання, **Дыяна Гушча** 27 кастрычніка 2020 года ў тэлеграм-супольнасці «Клічаў-чат» абразіла Аляксандра Лукашэнку — пад публікацыяй з выявай Лукашэнкі і тэкстам: *«Гэта што, нармальна, калі натоўп п'яны, звар'яцелы, праколаты наркотыкамі, пракураны і прапіты, сотні чалавек рынуліся ў гэтыя раёны. Што трэба было рабіць міліцыі?! Гэта быў мой загад, каб засцерагчы людзей. Пачалі выкрываць кватэры, рынуліся туды, давялося з кватэр выцягваць гэтых наркаманаў»* з дапамогай свайго мабільнага тэлефона пакінула каментар: **«Няма такіх слоў у маім лексіконе, якое б падышло гэтаму падонку»**.

Дыяна Гушча патлумачыла, што пакінула каментар на эмоцыях, віну ва ўчыненым злачынстве прызнала ў поўным аб'ёме.

Падчас спрэчак пракурор **Мікалай Белавусаў** запрасіў для Дыяны Гушчы пакаранне ў выглядзе двух гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання на два гады, а таксама папрасіў ўскласці на абвінавачваную наступныя абавязкі:
• не выязджаць па асабістых справах на тэрмін больш за 1 месяц за межы месца знаходжання;
• перыядычна адзначацца ў міліцыі;
• знаходзіцца з 22:00 да 6:00 па месцы жыхарства;
• забараніць наведваць забаўляльныя ўстановы.

У выніку суддзя **Ларыса Корза** пастанавіла: **прызначыць абвінавачанай два гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання на два гады**, устанавіць забарону дзеянняў, якую запрасіў дзяржаўны абвінаваўца, мабільны тэлефон канфіскаваць у даход дзяржавы як сродак здзяйснення злачынства.

t.me/viasna96/7694
4.5K viewsOct 19, 2021 at 18:10

Context

Embed

View In Channel

<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"

Copy